Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспацэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 9 Кастрычніка 1914 г. № 40

**Прыймаецца далей падпіска на „Нашу Ніву“ на 1914 г.**

Цэна на год—2 р. 50 кап., на 9 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.—65 к., на 1 мес.—25 кап.

*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

## Вайна і налогі.

Вялікую цяпер перэжываем вайну, вялікіх і ахвяр патрабуе яна. Мала таго, што грамадзянство дае сваіх сыноў на абарону гасударства, але яно, гэта грамадзянство, павінна ешчэ так ці іначэй даваць грошы на ваенные расходы. Бо толькі тое гасударство зможэ не дацца у крыўду або і перэмагчы свайго праціўніка, каторае ня толькі выставіць вялікую лічбу добра абучэных ваеннаму дзелу салдат, але калі яно побач з гэтым мае за сабою сілу экономічную.

Але якбы казна не была багата, то пры над'звычайных здарэньнях, як напрыклад вайна, голад, патрабуюцца і над'звычайные расходы. Пры гэтым вышуківаюцца способы аткуль і як дабываць грошы на гэтые расходы. Способы ёсьць два: або пажычыць у суседоў, або падвышыць старые ці прыдумаць новые налогі. Пажычыць у гэту усесьветную завіруху німа дзе, бо тые ваююць і самі павінны дабываць грошы на расходы, а тые рыхтуюцца к абароне ці вайне і так сама пажычаць іншым ня могуць. Астаюцца толькі налогі. Гасударственые налогі бываюць дваякіе: простые (безпасрэднie) і пабочные. Простые налогі — гэта падаткі з зямлі, с фабрык, з насьледзтва і інш. Агулам простые налогі—гэта такіе, дзе кожны ўласьнік плаціць безпасрэдня пэўные падаткі за сваё дабро. І разумеіцца чым ён больш мае — напр. дзесяцін зямлі — тым болей і выплачывае. Пабочные-ж налогі зусім іншые: збіраюцца яны не с таго, хто штось мае, а с таго што пaступае на продаж, як напр. акцыз на табаку, цукер, гэрбату і інш., або таможэнны збор з заграпічных тавароў. Пабочные налогі аднакова плацюць і бедны і багаты. Гэтак расейскі урад у сваім часе шмат зьбіраў (каля тысячы мільёноў рубл.) налогоў з акцызу на гарэлку. Цяперака, калі спынена продаж на гарэлку, урад павінен ня толькі дастаць грошы на гасударственые расходы, каб пакрыць гэтую акцызную нядоімку, але ешчэ павінен дастаць іх і на ваенные расходы.

І вось мы бачым, што ужо на некаторые рэчы падвышэны у нас да канца вайны акцыз, як напр. на табаку, падвышана пачтовая аплата і інш. Гэтые падвышкі канечна, не павінны нас пужаць, бо і палавіны ня прыдзецца нам плаціць таго лішняго, што мы выкідалі у сваім часе на гарэлку, затруваючы у дадатку сваё здароўе і часта-густа пападаючы на «скам'ю падсудзімых». Апрача падвышэньня некаторых пабочных налогоў, урад маніцца ешчэ у скорым часе завясьці падаходны і асабісты ваенны налог.

Падаходны налог падобна простаму выбіраецца с тых, хто болей зарабляе ці хто болей с чаго мае даходу, той болей і плаціць. Гэтым налогам будуць ападаткаваны толькі багацейшые людзі, маючые ня меней 2000 р. у год даходу. Асабісты ваенны налог будзе выбірацца с тых, хто па якой колечы прычыне увольнены ад адбываньня воінскай павіннасьці, і кожны гэткі плаціць будзе 6 рублёў. Першы падатак будуць уносіць тые, што прызываліся у апошніе 4 гады. Так сама маніцца урад зрабіць новую перэацэнку зямлі і падвышыць, стасоўна да яе вартасьці, гасударственны пазямельны налог. Усе гэтые новые налогі і падвышэньне старых урад праводзіць па 87 стацьці аснаўных законоў.

Трэба ешчэ тут сказаць, што праект закону аб падаходным налогу быў даўно унесены на разгляд Гасударственнай Думы, і толькі цяпер, дзякуючы вайне, гэты закон увойдзе у жыцьцё. Але як-бы сабе там не было, мы ва ўсім гэтым бачым адну вельмі карысную для ўсіх рэч—гэта падаходны налог. І вось, вітаючы яго, нам астаецца толькі цешыцца, што думка шчырага расейскаго грамадзянства дарма ня згінула, і гэты налог, аснованы на справедлівасьці, знойдзе нарэшце сабе мейсцэ у Расейскім гасударстве.

I. Л.

---

# ВАЙНА.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

Перэгледаючы весткі за тыдзень ад штабу Верхоўнаго Глаўнакамандуючаго, прыходзіцца заўважыць, што тутака, у Галіччыне, ідуць сур'ёзные ваенные сустрэчы с перамогай расейскаго войска над аўстрыякамі. Бітвы развіваліся на поўдня ад Перамышля. Пробы аўстрыякоў перэбрацца цэрэз рэку Сан расейцамі атбіты. 5 кастрычніка (акцябра) у гэтым раёне расейцы у вельмі заўзятых бітвах дасьціглі ў часьці перамогі над праціўнікам. 6 кастрычніка. Наша войска, часьцю у цесных сустрэчах, а часьцю ў бітвах з непрыяцелем на фронце ад рэчкі Зуры да Стрыя. Паўдзённей ад Перамышля наша войска далей забірае у палон тоўпы палонных. Адзін аўстрыяцкі батальён аддаўся поўнасьцю са ўсімі афіцэрамі і кулемётам.

### Расейска-Нямецкая.

Нямецкае войска, напіраўшае на расейцоў на левым беразе Віслы на шляхах к Івангораду і Варшаве, 2-го кастрычніка перайшло пад націскам нашаго войска на ўсім фронце к абароне. Такім парадкам, паход немцоў на шляхах к Варшаве і Івангораду зусім не ўдаўся, і цяперака прыходзіцца ім у многіх мейсцах адступаць назад. На ўсходне-прускім тэатры вайны зацішшэ.

### Французска-Англіцка-Нямецкая.

Да арміі фарцуска-англіцкай прылучыўся ешчэ адзін хаўрусьнік—Бэльгійцы. Пасьля здабыцьця немцамі Антвэрпэну, бэльгійскае войска разам з падмогай англіцкаго выкруцілася ў бітвах з рук нямецкіх і злучылася з левым крылом францускіх армій. Такім чынам, лінія француска-нямецкаго фронту расьцягнулася ешчэ далей на поўнач, чымся ўперад, даходзючы аж да Паўночнаго мора. Немцы наступалі у напрамку Брюгге-Остэндэ у Бэльгіі і ў напрамку Дюнкірхена і Газбрука у Паўночнай Франціі. У гэтым апошнім напрамку яны спаткаліся с сур'ёзным супраціўленьнем францускаго войска. Бітвы тут адбываюцца страшэнна заўзятые, і ў некаторых мейсцох хаўрусьнікі карысна напіраюць, перэмагаючы праціўніка. Агульная развязка будзе шмат залежыць ад таго, які прыймуць абарот бітвы на гэтым фронце. Немцы гэта разумеюць і сьцягіваюць сюды сабе падмогу.

### Японска-Нямецкая.

Японцы вострa забіраюцца да здабываньня Ціндао. Немцам заявілі, каб яны выслалі с крэпасьці усіх непамагаючых у абароне жыхароў—кабет і дзяцей, што немцы і зрабілі. Цяперака японцы устанаўліваюць каля Ціндао цяжкіе гарматы і бамбардуюць. Між іншым японскаму войску загадана як найхутчэй здабыць Ціндао і гэтым аслабаніць флот, каторы ня можэ выйсці ў морэ, пакуль не ўзята крэпасьць.

### Сэрбска-Аўстрыяцкая.

Сэрбы далей заўзята змагаюцца з аўстрыяцкім войскам. Крывавые бітвы ішлі на правым крыле размешчэньня сэрбскаго войска і на левым беразе Савы. Усе атакі аўстрыякоў сэрбы дружна адбівалі. Пры чым, пасьля заўзятых атакоў аўстрыяцкаго войска на левым беразе Савы, сэрбы перамаглі, і праціўнік атступіў к Бежэнье, пакінуўшы на полі 300 забітых і шмат раненых. 1 кастрычніка сэрбы атакавалі першые украпленьня Курачыцы і аткінулі праціўніка к Дрыне, гдзе множства салдатоў патанула, а часьць аддалася у палон сэрбам. Аўстрыякі усё ешчэ час-ад-часу абстрэліваюць Белград.

### Чэрнагорска-Аўстрыяцкая.

Чэрнагорскае войска трымаецца блізка ад Сараева на вышынях Романіі і пануе над важнейшымі горнымі праходамі на поўдня ад Сараева. Палажэньне чэрнагорцоў вакруг горада добрае. Гарнізон Каліновіка не адважываецца выступіць у бітву с чэрнагорцамі і толькі абараняецца. На фронце Гацко-Білеч чэрнагорцы пасунуліся наперад. Гарнізон Катарро напаў 3 кастрычніка на чэрнагорскіе атрады, але быў атпёрты.

---

### Вайна на моры.

Па загаду расейскіх марскіх уласьцей пазакладаны на моры у праходах у Фінскі і Рыжскі заліві мінные загароды. Гэта зроблена дзеля таго, каб непрыяцельскіе параходы не маглі падыходзіць к тым мейсцам, дзе заложэны міны. Цяперака гэтые праходы закрыты для ўсіх караблёў.

Пры атакаваньні 27 і 28 верэсьня расейскіх крэйсероў нямецкімі падводнымі лодкамі дзьве з іх зністожаны. Затоплена на Паўночным моры нямецкая падводная лодка № 12. Пры атакаваньні каля Катарро францускаго флоту дзьвума аўстрыяцкімі падводнымі лодкамі, адна з іх затоплена. На Нямецкім моры згінуў ад падводнай лодкі англіцкі крэйсер «Гок». Японцы захапілі адзін нямецкі параход, другі патоплены немцамі. Каля Кіао-Чао разбіўся аб скалу нямецкі міноносец № 90.

---

У **Бэльгіі**. Немцы ужо загарнулі бадай увесь гэты край. Бэльгійскі урад перэсяліўся у Францію. Кароль ёстаўся пры сваей арміі, каторая, як ведама, злучылася ужо с францускай. Немцы маняцца абвесьціць аб прылучэньні Бэльгіі да Нямеччыны.

У **Голяндзіі**. Тутэйшы урад пасьпешна прыгатовываецца да абароны сваіх граніц з мора. Ёсьць прычыны, што немцы пакваляцца нарушыць нэйтралітэт гэтаго гасударства, і быццым ужо зграмаджываюць немалые сілы каля граніц Голяндзіі.

У **Даніі**. Тутэйшы Чырвоны Крыж узяў на сябе перэдаваньне спіскаў расейскіх палонных, што ў Нямеччыне, і наадварот. Спіскі з Нямеччыны ужо пачынаюць паступаць.

У **Португаліі** абвешчана часьційная мобілізація. Проці гэтаго паўстае Нямеччына. Пасол нямецкі у Ліссабоне заявіў, што калі Португалія ня спыніць мобілізаціі, то Нямеччына прыйме гэта як абвешчэньне вайны.

У **Італіі**. Паміж італьянскім і аўстрыяцкім урадамі што раз меней сагласу. У Італіі вельмі нездаволены с таго, што аўстрыякі паслалі на першы агонь проці сэрбоў паўкі састаўленые з італьянцоў Трiесту і Трэнтыку, праз што згінула шмат людзей з гэтых паўкоў. Францускае войска на італьянскай граніцы атклікана на тэатр вайны. На граніцы асталіся толькі вартаўнічые атрады.

У **Румыніі**. Тутака кажуць, што новы румынскі кароль Фэрдынанд будзе прытрымліваццa тых самых адносін да вайны, што і памёршый яго дзядзька, т. е. ня будзе зусім мешацца у вайну.

У **Турэччыне** усё прыгатоўліваюцца к вайне. Цяперака паміж немцамі туркамі і болгарамі ідуць сэкрэтные перэгаворы. Што з гэтаго выйдзе, ешчэ німа ведама. Ёсьць чуткі, што прыгатоўліваецца злучэнае выступленьне турэцка-албанска-болгарскіх чэт (атрадоў), як сыгнал новаго пажару на Балканах.

У **Пэрсіі**. Курды не ўспакаіваюцца. З Урміі 3 кастрычніка паведамляюць, што пачалося наступаньне турэцкіх курдоў Салмаса. 20,000 кудроў перайшоўшы граніцу, скіраваліся к Чырыку. За імі ідуць паткрапленьня.

У **Амэрыцэ**. Паведамляюць з Бэрліна, быццам у Амэрыцэ у звязку з заняцьцем праз японцоў адной с Каролінскіх выспоў, абвешчэна мобілізація арміі і флоту. Апошні зграмаджываецца на Філіпінах.

У Амэрыцэ цяперака знайходзіцца 550,000 аўстрыяцкіх і нямецкіх запасных, якіе па новаму амэрыканскаму закону ваеннаго часу ня могуць атрымаць права выезду.

## Каля вайны.

**Як умацовываюцца немцы.**

Газэта «Secolo» апісываець пазыціі забраные нямецкімі войскамі у франціі і выгледаючые якбы адной аграмадной пад'зямельнай крэпасьцю. З ваеннаго погляду сур'ёзна трэба зварнуць увагу на гэтые вялізарные муравельнікі, у якіх сідзяць болей мільёна людзей. Зямельные украпленьні дзеляцца на тры часьці. Пярэдні рад—вартаўніцкіе форпосты (пярэдняя страж). З заду іх—на 200 мэтроў далей (каля 94 сажнёў)—глаўные акопы, якіе пакрыты ў некаторых мейсцах шчытамі для абароны ад стрэляньня с аэропляноў. За гэтым радам ужо німа непрарыўных акопаў, толькі—аграмадные доўгіе ямы, у якіх пастроены спальні для салдат, палёвые кухні і склады с прыпасамі харчоў і аружжа. У гэтых самых ямах уладжываецца і артылерыя. 4-ы і апошні пояс—гэта ёсць углыбленьні, дзе хаваюцца батарэі цяжкіх арудзій, пастаўленые на асобных цэмэнтаваных пляцформах. Гэткім парадкам нямецкіе украпленьні падобны да пад'зямельнаго горада с цэлай сыстэмай перэкрыжоўваючых адна адну вуліц. Такіе украпленьні пастроены па ўсей ваколіцы, ад рэкі Эн да Аргонскаго лесу. Некаторые з іх так кемна замаскаваны, што ўсе іхніе чатыры пaясы, дзе хаваюцца тысячы салдатоў, не відаць с самаго блізкаго мейсца.

**Страты ў флотах ваюючых дзержаваў.**

Афіціальна вядома, што ад пачатку вайны хаўрусьнікі захапілі 358 гандлёвых нямецкіх караблёў. 15 нямецкіх караблёў, што маглі быць ваарyжанымі, затрымана у портах Амэрыканскіх Злучэных Штатоў. 14 караблёў астаюцца у Суэцкім канале. Нямеччына захапіла або патапіла 86 англіцкіх караблёў.

## † „Camillus“.

4-го жніўня у адной з бітваў на нямецкай граніцы быў забіты на мейсцы малады здольны артыста Каміль Мацкевіч, рысункі катораго за подпісам «Camillus» добра вядомы ў нашай старонцы.

«Camillus» вучыўся у артыстычнай школі ў Варшаві і у Кракоўскай акадэміі, а пасьля працаваў у Парыжы, Лондоне і Нью-Іорку, як каррыкатурыст. Але ў чужых старонах доўга не ўседзіў: сам быу родам с Віленшчыны, цягнула яго да родных ніў, і вось летась пад восень ён перабраўся на жыцьцё ў Вільню.

Тутака «Camillus» знайшоў для сябе багаты матэр'ял. Як карыкатурыст, ён у польскай дэмократычнай газэці «Kurjer Krajowy» у надта прыгожых рысунках высьмеіваў тых, хто, прыкрываючыся пекнымі словамі, ідзе проці грамадзянства, дбаючы адно аб сваю карысьць. Але газэта жыла нядоўга: гэтай вясной яна закрылася, і «Camillus» перабраўся ў Варшаву.

Але аб нашай старонцы не забываўся. Прыежджаў сюды, ездзіў па вёсках, збіраў народные вырабы, зрысовываў беларускіе арнамэнты, і апошняй працай яго была сэрыя аткрытак з беларускімі тыпамі.

Тутака, ў Вільні, «Camillus», як запасны, быў узят у салдаты. С сумнай душой жагнаўся с сваімі таварышамі, не маючы надзеі болей з імі пабачыцца...

І праўда: згінуў у адной с першых бітвоў.

Пражыў толькі 29 гадоў. Пакінуў па сабе багата рысункоў ды абразкоў.

Вечная памяць яму!

## Песьні Вайны.

**III. Склік.**

Напрарачыў. наваражыў
Бяды сабе квол чэлавек,—
Крывавых бур ня збыў, ня зжыў,
Заломоў не парваў, ня ссек.

Ад самагубнасьцей дзікіх,
Ад трупа-значэных дарог
Не пастрымалі сэрц людзкіх
Ні право іхнее, ні Бог.

Ударыў гром, завыў пажар,
Склікаюць трубы на паход;
Йдзе край на край, на цара—цар,
Народ падняўся на народ.

Скрось сьвету йдзе аружны склік
Паставіць сілу проці сіл;
Жадае сьвет, як сьвет вялік,
Даўно варожэных магіл.

Устань, хто жыў, устань, хто дуж
Нясьці аружжэ, ў бітвы йсці!
Кінь матку сын, кінь жонку муж,
І хату кінь у забыцьці.

Устань! устань тачыць штыкі,
Знамёны шоўкавы сьвяньціць!—
Ешчэ жыве закон такі —
За сьмерці сьмерцямі плаціць.

Адважна ў бой рыхтуйся, брат, —
Баяцца нечага крыві,—
Твой прэдак выліў яе шмат,
Ты памяць прэдкоў ад'жыві!

Каня буланаго седлай,
У стрэльбу крэпка ўбі набой
І, блаславіўшы бацькоў край,
Едзь па загаду ў грозны бой.

Як дасьцігнеш чужацкіх гонь,
Патопчэш ворагаву рунь,—
Ты матку-бацькоўшчыну ўспомнь,
І ў бок кінь вокам сваіх пунь.

А чэлавечае на цэль
Жыцьцё узяўшы на прасьцяг,
У грудзі сьвенчаные стрэль,
Адно ня сцэль ў крыж на грудзях.

Адважна ў бой!.. Вайна вайну
Спладзіла,—хай-жэ бітва йдзе
За шчасьця лепшаго вясну,
За волю вольнай грамадзе!

Аб долі роднай стараны
Нам сьведчыць не адзін курган,
Дзе дрэмлюць слаўные сыны,
А страж дзяржыць ноч ды туман.

**Янка Купала.**

Вільня 5/х—14 г.

## Ад крыві чырвонай...

Ад крыві чырвонай Нёман фарбаваўся,
Ладзіліся гаці с трупаў на вадзе;
Стогн разьні адважнай гулка раздаваўся—
Бітва як ніколі... Бітва як нідзе!

Людзі, коні ніклі коласамі ў полі,—
Малаціў галовы алавяны град...
Жартавалі с сьмерці—лезьлі яшчэ болей;
Топчылі жывые няжывых грамад.

Затуманіў неба цёмна—дымны порах,
Жорлышчы гарматаў кархалі агнём;
Ціхіе сялібы нішчыў дзікі вораг..
І дабро людзкое панясло віхром.

У зямлі глыбока рыліся шрапнэлі,
Над зямлёй высока пёрся самалёт;
Сярод іх, над полем груганы ляцелі,—
На гульню-вячэру ладзілі паход.

Ой, для іх пажыва вельмі ўжо багата!
Ой, вісіць бязмерна гібель над зямлёй!
Ой, крыві залішне! Ой, крыві занатта!
Ажна ап'янелі, патанулі у ёй!.

—Гэй ты, бацька-Нёман, бачыў ты спрадвека
Гэткіе рабункі на сваіх вадах?..
Ці німа граніцы злосьці чэлавека?
Ці ўвесь сьвет павінен гінуць у сьлезах?

А крывавы Нёман з берагоў падняўся,
Якбы пасыцеў ён ад сваіх ахвяр,
Па пяску, каменьнях буйна разагнаўся,
У абоймах сьціснуў ён палёў абшар...

Нёман сказ свой гукнуў: «Хай гудзяць віхоры!
Хай грымяць гарматы! Хай нясецца стогн!
Хай шкілеты-косьці вырастуць у горы!
Я пішу крывёю вечны свой закон!—

Да сваіх я добры! іх кармлю гадую!
Да чужых я страшэн, нібы пекла ліх...

## ГАБРУК.

*Ахвярую О. Страшынскай.*

I

Ешчэ з вечэра Габрук пачаў зьбірацца на фэст. Змазаў колы, расчэсаў каню хвост і грыву, наладзіў сядзэньне у драбах.

Габрук Пупырскі чэлавек с таго сорту людзей, каторые пільна трымаюцца усіх царкоўных правілоў, і за гэтае прыход выбраў Габрука царкоўным старастам. Габрук моцна шануе свой чын, гардзіцца ім і акуратна выпаўняе усё, што належыць і патрабуецца ад старасты. І ўжо поп н і к о л і за ім не мае ні у чым атказу, Габрук усім стараецца выстарчыць. Праўда, і за яго стараствам, як і да прэж, нічога такога незвычнага не сталася у прыходзе,—парадкі усе тые самые, што былі і калісь, у царкве ўсё па стараму,—але німа чаго казаць, Габруком давольны усе — як поп, так і дзяк, так і самі прыхажане. Габрук не мінае ні воднага фэсту, і як ён у пастаці старасты, то рупіцца пасьпець туды першым.

У гэты раз ён рыхтаваўся на фэст у вёску Аславеняты, дзе кожны год адбываецца у старой капліцэ малебство і зьбіраецца многа народу. Габрук, як і заўсёды рупны у кожным дзеле, хутка сабраўся у дарогу. Ешчэ толькі сонцэ пачало узыходзіць, як выехаў ён с свайго падворку. У перадку драбаў лежаў пачок са сьвечкамі і невялічкі клумак, а у задку, на сядзэньні, усседаў сам Габрук і трымаў лейцы і пугу.

II

Сонцэ ясна, усім абліччэм, глядзела з неба, спускаючы сваё праменьня на дарогу, на поле, на лес, што расьце пры дарозе, і на самога Габрука. Габрук цешыўся з добрай пагоды і радаваўся, што яна прыманіць на фэст ні мала народу. З'едуцца паны са сваіх прыходаў, зьбяруцца і старасты; а пасьля усяго будзе прыгатаваны смачны абед... з імянінні-камі Летась памешала тыкі пагода, і усе раз'ехаліся сярдзітые. А сягоньня... Гэтак прыгожа!..

Габрук уздыхнуў... Радасьць ня можэ доўга трымацца у сэрцу і патрабуе выхаду,—яна, як птах, вырываецца з грудзей ці ў лёгкім уздоху, ці ў вясёлым сьмеху. Габрук быў у вясёлым гумару. Гэта вясёласьць зглядалася і у яго твары, і у яго руху, выбівалася праз новую вопратку, што надзеў ён выежджаючы з дому, — і адбівалася у нашваксованых ботах, каторые кончыкамі насоў тырчэлі с-пад саломы і зіхацелі на сонцы... Прыгожасьць дня напаўняла сэрцэ Габрука і вызвала ў ім набожнае пачуцьцё. Ен ехаў праз урочышчэ Божы-Дар, і першы раз у жыцьцю здзівіўся хорашасьці гэтага названьня і таму вялікаму значэньню і абшырнасьці мысьлі, што захаваны у гэтых двух словах.

«Божы Дар!..»—Ды гледзячы на гэтые каласы, на гэтые межы с кветкамі, на гэтые кусточкі, што растуць далей, пад лесам — гледзячы на усё гэта — хто скажэ, што гэта ня Божы Дар!?. — Гэта дар людзям за іх моцную працу...

— А во, і пчолкі на кветках... Жужукаюць, працуюць... Сонейка ім крылачкі грэе, а яны мядок носяць і воск лепяць... Мядок людзі спажывуць, а воск Богу на ахвяру...

Тут Габрук прызадумаўся. Хоць ён і рэдка калі браўся думаць і нават не вялікі ён ахвотнік да моцных думак, але як гэта здараецца с такімі людзьмі,—возьмуць думкі ды затрымаюцца на а д н ы м, нібы конь нараві-сты у аглоблях: но, но! а яны ані з мейсца, і точацца сваім жыгаллам, немяркуючы, як блыха, забраўшыся дзе колек..

Вось гэтак сама здарылася і цяпер. Габруку раптам здалося, што чэлавек робіць вялікае зло, выкарыстываючы працу гэтаго малюсенькаго стварэньня Божаго—пчолкі. Ен адбірае у яе працу яе, воск і аддае на ахвяру... Аддае на ахвяру тое, што адабраў сам у малюсенькай жывёлкі!.. А гэта ахвяра, ці прыемна яна Богу?.. Гэта ж яна не ад працы чэлавека, а ад працы кузурачкі, каторай чэлавек заўладаў. — Габрук зірнуў на пачок са сьвечкамі, і тут яму зрабілася стыдна за свае грэшные мысьлі. Ен панурыў галаву і глядзеў на пачок, якбы чэкаючы ад яго атказу. А мысьлі усё раіліся у галаве і цялі Габрука сваімі жыгаламі.

Тым часам, кабылка Габрукова, пушчаная па волі, ішла сабе памаленьку; дало-ж ей ліха, што і ня згледзіў Габрук, як павярнула у бок, а на той час, па загаду земскаго, побач дарогі былі выкапаны глыбокіе канавы,—дык адна старана драбаў раптам пахілілася ў роў...

Нешта трэснула, нешта зазьвінела і разьбілася...

— Тпру, тпру! Закрычэў Габрук на каня, а сам хутчэй адвярнуў салому у сядзэньні і пачаў нешта рупна там разглядаць. — Вот табе і зарабіў!.. Сколькі, дзьве?.. Так і ёсь!— Цэлых дзьве адразу!..

Ешчэ пакапаўся Габрук у сядзэньні, пазваніў чэрэпкамі і выкінуў у канаву шкло.. Сіненькая паперка на куску бутэлькі пырхнула матыльком у паветры і улеглася на дно рову, а праз шчэліны драбаў горкімі сьлязьмі пацекла горкая вадзіца, пакідаючы за вазом мокрую дарожку...

З гэткаю любоўю як сваіх шкадую,
З гэткай самай злосьцю нішчу я чужых!

**Ясакар.**

Вільня. 5/x—14 г.

## Чэкайце сваіх...

Па сялібах і вёсках чэкайце братоў, сыноў і бацькоў сваіх, што вернуцца с поля біцвы! Хай шнуры вашы будуць упарадкаваны на зіму як мае быці; хай запрацаванае дабро вашэ будзе змалочэна, у гаруды сабрана, як заўсёды; хай праца штодзённая ідзець сваім звычайным ладам, і вы, спадзеваючыся супакою, чэкайце родных сваіх с поля біцвы! Абагрэіце, накорміце іх, пацешыце прыхільнасьцю шчырай раненых; аб тых, нехапаючых, без крыжоў пахаваных, памаліцеся... І жыцьцё зноў пачне будоўлі свае будаваць.

Чэкайце сваіх!

Ой, шмат чаго яны і вам прынясуць с сабою вартнаго і карыснаго. Яны вам скажуць, што сіла—у злучэньні вялікім, у шчырасьці, у адвазе і праваце сваей... Яны вам скажуць, што кожнаму народу трэба стаяць за сваё, толькі за сваё... І гэтым самым прыносіць ён карысьці ўсім, паказываючы свае самабытные творчасьці, а не копіі—зьнімкі с чужога... Усе людзі на зямлі, ва ўсей здабыванай дагэтуль культуры сваей, стараліся кожны толькі сваё выказываць... Яны вам скажуць, гэтые вашые ваякі, што хто галаву сваю хіляець, пужаючыся, той нявольнікам стане у чужынца і будзе пыл ад яго ног быціраць... Яны вам скажуць, што трэба пужацца не жыцьця у сьмерці, а сьмерці у жыцьці... бо яшчэ больш небаспечна сьмерць духа, калі чэлавек ня можэ стаяць за сваё «я»; калі ён, нібы губка, убіраець, упіваецца толькі пабочным, а сваё роднае у яго расплываецца, гіне...

Чэкайце сваіх!

І новае жыцьцё разверніць у шыр і ў высь скрыдлы свае...

**Змітрок Бядуля.**

## З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

**Забарона.** У Вільні (а такжэ і ў Мінску) выдана абавязковая пастанова, па якой пад штрафам да 3000 р. або да 3-х мес. арышту у турме ці крэпасьці забараняецца купляць ад ніжніх чыноў (ад салдат) і іншых асоб якіх-бы то не было рэчэў ваеннаго абмундураваньня (адзежы), обуві і іншых ваенных прыбораў.

**Таргі.** За няўзнос селянскому пазямельнаму банку на срок ратоў за выданые пажычкі, віленскае аддзяленьне тэтаго банку назначыла на продаж 30 з лішнім двароў (маёнткоў), распаложэных у Віленскай губ. і належачых да розных асоб. Таргі на продаж гэтых двароў адбудуцца сёлета у сьнежні: 10-го у Троках, 11-го ў Дзісьне, 12-го ў Лідзе, 13-го ў Сьвенцянах і 15-го у Вільні і Ашмянах. Нядоімшчыкам, якім труднавата выплаціць нядоімкі с прычыны неўраджаю або пакліканьня іх сем'яніноў на ваенную службу, банк дае магчымасьць хлапатаць аб зьняцьці с таргоў іх маёнткоў.

**Новая вучыцельская сэмінарыя.** З міністэрства народнай асьветы атрымана пазваленьне на аткрыцьце ў Нова-Вілейску вучыцельскай сэмінарыі. Аткрываецца пакульшто першая кляса для 35 вучнеў.

**Сярод «уцекачоў».** У Вільні з 257 уцекачоў літоўцаў, дагледаных літоўскім камітэтам для нясеньня помачы уцёкшым з мейсцоў ахопленых вайной, асталося 150 чэлавек. Аднак часьць уцекачоў, якіе разьехаліся дамоў, карыстаючы з дармавога праезду па чыгунцэ, цяперака вертаецца назад. Заместа сваіх хат і сяліб яны знайшлі на бацькоўшчыне адны толькі руіны. Усе гэтые «сачыльшчыкі» прыехаўшы у Вільню ізноў зьвярнуліся па запамогу ў літоўскі камітэт, каторы іх з аткрытымі рукамі і прыймае.

**За дзьве жонкі.** Адольф Токар, маючы ужо адну жонку і дзяцей у вількамірск. пав., кінуў іх і ажаніўся з другой—з Зосяй Шэмятышкай, Гелванскай парафіі, у віленскім пав. Цяперака «двужонніка» у Гелванах арыштавалі, а справай заняўся судзебны сьледавацель.

### З Міншчыны.

**Ваенны музэй.** У Мінску наладжываецца музэй вайны. Пачаўся збор уселякіх рэчэй, выдавецтвоў і інш., адносячыхся да перэжываннаго цяперака часу эўрапэйскай вайны.

**„Уцекачы“.** За эпошніе дні у Мінску наплыло шмат уцекачоў з захопленых вайною мейсцоў. Тутэйшые рэстараны і кавярні і іншые харчэўні перапоўнены. Гасьцінніцы біткем набіты. Сярод мейсцовых палякоў арганізуецца помач для бяднейшых уцекачоў.

**Табака для войска.** Інтэнданцво закупіла у мінскіх табачнікоў 51,000 пудоў махоркі і надовічы атправіло з Мінска у дзействуючую армію.

**Зьезд фабрыкантоў гарэлкі у Мінску**, склікан з мэтай наладзіць варункі гарэлачнаго промыслу, у звязку с пачаўшымся ацьвераженьнем народу, пастанавіў: зьменшыць выганяньне спірту; бульбу перарабляць на крахмал, або сушыць яе на корм для жывёлы заместа збожа; старацца, каб урад дапамог у тэхнічным пашырэньні сьпірту па казённых установах, для руху самаходоў, для асьвітліваньня вагзалоў і інш. будоўляў, а такжэ аб выдаваньні позваленьня ўласьнікам бравароў на дэнатураваньне (прыводзіць у непрыгоднасьць да піцьця) спірту, с правом як найшырэйшай прадажы яго жыхаром. Зьменьшэньне лічбы бравароў прызнана нежаданым дзеля таго, што гэта грозіць разстройствам гаспадарскаго промыслу.

**Пэтыцыя прысяжных заседацелеў.** На апошней сэсіі мінскаго акружнога суду у Барысаве з участьцем прысяжных заседацелеў, апошніе зьвярнуліся с пэтыцией (просьбай) к прэдседацелю, у якой прыцьверджаюць, што с прайшоўшых прад імі угалоўных справоў відаць, што гэтые справы паўставалі с прычыны п'янства, дзеле чаго трэба канечне закрыць усе шынкоўні ў гор. Барысове і ў павеце на заўсёды.

**Новая газэта** штодзенная пачала надовічы выходзіць у Бабруйску пад названьнем «Бобруйскій Курьеръ».

**На р. Бярэзіне** каля Парычаў у часе плаваньня ушкоджэны параход «Варяг». Страты на 1800 руб. На гэтай-жэ рэцэ каля Цярэхава затанула барка, напакаваная яблыкамі. Страты на 600 р.

**Растрата.** Зробленай у канторы бабруйскаго натарыуса Яшчынскаго рэвізіей (вобыском) устаноўлена немалая растрата даверэных Яшчынскаму па службе грошы, даходзячых колькідзесят тысяч руб. Сьледзтва ідзе.

---

У **Гродзеншчыне** графіня Марыя Патоцкая падаравала с свайго маёнтку вучастак зямлі на пабудаваньне селянскай бальніцы у мястэчку Высока-Літоўску, гродзенск. губ. Урад ужо пазволіў прыняць гэты падарак.

**Гадоўшчына.** Надовічы скончылася роўна 10 год, як першы раз пазволено друкаваць у Расеі першую у літоўскай мове газэту «Lietuviu Laikraštis». Рэдакціі і таварыствы, хочучы, могуць атрымаць першы нумэр гэтай газэты дарма у рэдактара-выдаўца А. Смільго, Петраград, Кацярынінскі канал, д. № 10.

## З усіх старон.

**На помач пацярпеўшым ад вайны.** У савеце міністроў хлапочыць міністэрство унутрэнніх справоў аб отпуску 5 мільёноў руб. на запамогі жыхарам пацярпеўшым ад вайны. З гэтых грошы міністэрство маніцца выдаваць пажычкі на прыдбаньне хлеба і будоўлю хат.

**Апека над дзяцьмі і іх матка-**

---

— Зарабіў, як Заблоцкі на мыле,—вурчэў сабе Габрук...

Трэба ведаць, што Габрук такі чалавек, каторы умее набожнасьць меркаваць з жыцьцёвымі патрэбамі, умее дзяліць іх, не праводзючы між імі мяжы. Ен ведаў, што за кожнай ахвярай можна учыніць карыснае дзела, такжэ сама, як с кожнай ахвяры проста скарыстаць што-колечы. З гэтакай мэтай Габрук выежджаючы на фэст палажыў у сядзэньне некольки бутэляк «навапольки».

— Ось, — кажэ, — прыгадзіцца. . Патрабуюць многа. Лічы, пагрыўні з бутэлькі,—дык і выйдзе за патрачэны дзень і за дарогу...

Пачуцьцё Габрука адразу зьмянілася. Праз увесь канец дарогі ён чуў сябе маркотна. Нібы сонцэ ня грэла, нібы цёмная хмара звалілася Габруку на сэрцэ. Ен быў згрызены.

Яму шкада было пабітых бутэляк, але ешчэ горш было ад таго, што яму хацелася-б ведаць, за што гэтая кара?..

— Нейначы, за мае грэшные мысьлі,—думаў сабе Габрук. Сказана у пісаньні: «не мудрствуй»... а я тут разьвёў нейкую крутню мазгамі...

Бо і праўду сказаць,—якое мне дзела да гэтых пчол, або да іх воску?!—Так расьпекаў сябе Габрук пад'ежджаючы да мейсца.

III

Прыехаў Габрук да цэрквы, ешчэ не званілі. Тое-сёе справіў, праведаў, што прыедуць тры папы і два дзякі, відзеў, што народу прыбывае многа, але пачуцьцё яго ня лепшало. Усё нешта грызла Габрука...

Зазванілі у цэркву, пачалася служба.

Габрук на гэты раз аказаўся адзін — ні воднаго старасты не было яму ў падмогу. Саўсім выбіваўся з моцы. Трэба і сьвечкі прадаваць, ды глядзець, каб грошы праўдзівые былі, каб часамі «дыткі» не хапіць, ды разставіць сьвечкі, дзе трэба. Трэба зрабіць усё, што трэба... А тут—адзін, ды ешчэ цесната гэтакая! Нават укленчыць нема дзе! Габрук хацеў маліцца, але брыдлівые мысьлі раіліся ў галаве і ён ніяк не мог звярнуцца да набожнага пачуцьця.

— Грэх, думаў сабе Габрук.—Грэх быць у цэркві і думаць аб розных непрыдумках. — Але ён нямог заўладаць над сваімі думкамі, і горш ад усяго яму лезьлі у галаву разьбітые бутэлькі, ды ешчэ тые, што засталіся у возе, захаваные ў салому.

— Здаецца, я іх добра захаваў. Але ўсякаго тут народу, ёсь такіе... могуць сьцягнуць...

Габруку рабілася неспакойна за свае бутэлькі; што мінута, то усё мацней яго цягнула паглядзець на свой скарб. І ён ня вытрываў: то плячыма, то лакцямі цярабячы сабе дарогу праз народ, выбраўся с цэрквы і праціснуўся між вазоў да сваіх драбаў.

Толькі зірнуў ён на сядзэньне, як адразу згледзіў, што нехта гаспадарыў у возе. Яго прачуцьцё збылося на праўду... Між пярэплеці у задку тырчэў пучок выцягненай саломы, посьцелка была сьцягнена, усё паказывала, што тут грабаліся нейчые рукі. Габрук хутка зьвярнуў салому у сядзэньні і стаў капацца і шчупаць у саломе.

— Укралі... укралі, зладзеі! Заёрзаў Габрук каля возу. — І гібелі на іх німа? Людзі маліцца прыехалі, а яны вазы абчышчаць... Зладзеі!.. — Толькі адна і засталася!..

Габрук закрыў воз і ешчэ горш згрызены вярнуўся у цэркву. Цяпер ён саўсім ня мог маліцца; усё думалася, хто сцягнуў бутэлькі?..

— Ну, ўжо, каб злавіў!.. Спазналі бы яны мяне! Не захацеўбы другі і на сьвеце жыць!..

У гэткік думках прастоіў Габрук аж да канца службы. Пачалі выходзіць, выйшоў і ён у астатку—як падабае старасту. Казаў сторажу замкнуць царкву, а сам стаў глядзець на народ, нібы шукаючы сваіх зладзеяў, і усё думаў, — што яму рабіць з гэтай апошняй бутэлькай?

Там каля рэчачкі сядзіць гуртох хлапцоў, яны моцна вясёлые; можа і яны гэта сцімрылі у Габрука водку? А там далей, на прыгорку пад вольхай, ешчэ адзін гурток...

— Дык жэ вось, нікога з іх не відаць было у царкве... Заўважыў Габрук. — А вун!.. Вун... ваду мераюць... бутэлькай!.. — П'яные усе!..

У Габрука сціснулася сэрцэ. Ен ужо ня мог болей узірацца. Хутчэй запрог каня і паехаў да дому.

Ехаў Габрук сярдзіты, галодны стрывожэны і увесь час толькі панукаў каня, выганяючы на ім сваю злосьць. Не узіраўся ўжо ні на кветкі, ні на нівы, і ня думаў болей аб пчолах. А прыехаўшы да хаты дастаў сваю бутэльку і крыкнуў жонцэ:

— Мар'яна, давай есьці хутчэй!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

На заўтра пачуў Габрук, што п'яные хлопцы зрэпіліся у бойку, моцна зьбілі адны адных, кагосьці запаролі ножам...

— Ага! падумаў у сэрцы Габрук.—Пакараў такі Бог зладзеяў за маё дабро! Прыйшла на іх пагібель!..

І у гэтай радасьці сваей Габрук заспакоіў сябе за ўчарайшую пакражу і забыў сваю неўдачу...

**Панас Гаварэнь.**

мі. Апекунство аберэганьня мацерынетва і дзяцей, якім Найвышэй апекуецца Гасударыня Імпэратрыца, пастанавіло аткрыць паўсеместна у Расеі часовые камітэты па догляду малалетніх дзяцей і іх матак, сем'яніны каторых пакліканы на вайну. Заданьнем апекунства ёсьць аткрываньне ясьлей і прыютоў для малалетніх дзяцей, днеўных прыпынкоў для матак і арганізація помачы у вышуківаньні працы.

Аб **праездзе сем'еў запасных.** Раз'ясьнено, што удоставерэньня, выдаваные сем'ям запасных валасьнымі упраўленьнямі і старастамі, ня могуць служыць правам для дармавых праездоў па жалезных дарогах.

**На „Чырвоны Крыж“.** Савет міністроў пастанавіў выдаць з грошы, прызначэных на ваенные патрэбы, 3 мільёны рублёў на падмогу для «Чырвонаго Крыжу».

**Спраўкі аб ваеннапалонных.** Заснаванае міжнародным камітэтам Чырвонаго Крыжу ў Жэневе (у Швэйцарыі) агенство ваеннапалонных паведамляе, што для атрыманьня справак трэба канечне абазначаць тую воінскую часьць, да каторай належала данная асоба, або, калі можна, нумар яе білету, мейсцэ бітвы, у якой гэта асоба магла быць ранена або ўзята ў палон, і агулам як можна болей падробных вестак у гэтай справе.

**Парадак выплаты** за дастаўленые рэчы у армію, як міністэрство ўнутрэнніх справаў разьясьніло, такі: за коні, павозкі і упраж, прыстаўленые для патрэбы войска запаснымі ніжнімі чынамі і ратнікамі апалчэньня, атпраўленымі ў дзействуючую армію і па гэтай прачыне не пасьпеўшымі зрабіць даверыцельных надпісаў на атрыманьне належачых ім грошай сваякамі ці другімі асобамі, выплата па талонах квітанцій, выплачываных казначэйствамі, можэ быць зроблена членам сем'ей запасных і ратнікоў без даверанасьцей, але па удаставерэньнях валасных ці паліцэйскіх упраўленьнеў аб тым, што гэтые асобы распараджаюцца гаспадаркай пайшоўшых у паход запасных і ратнікоў.

**Аб студэнтах.** Як пішэ «Веч. Газ.», ваеннае міністэрство мае паклікаць на ваенную службу студэнтоў першых двух курсоў з усіх расейскіх унівэрсытэтоў.

Як падлічэна сёлета, то да вайны ва ўсіх нямецкіх унівэрсытэтах было студэнтоў з Расеі 3,364, у гэтым ліку жыдоў каля 2,377.

**Паварот з вайны запасных** народных вучыцелеў, пасьля раз'ясьненьня генеральнаго штабу, ідзе у далейшым цягу. З гэтай прычыны, у некаторых сёлах і вёсках закрытые раней школы пачалі ізноў аткрывацца.

**Аб льгоце** для няшлюбных навабранцоў так выясьняе упраўленьне справаў аб воінскай павіннасьці: Льготу 1-го разраду можэ атрымаць толькі той няшлюбны сын, на катораго апецэ фактычна знайходзіцца матка, або іншые блізкіе сваякі, калі пры гэтым у маткі німа другога сына дасьцігшаго 16-ці год, або такога, што знайходзіцца на ваеннай службе і мае вярнуцца з войска у будучым гаду. Але няшлюбны сын, каторы вучыцца на кошт маткі, права на льготу не мае. Калі-ж ён да канца навук дастане атсрочку, а пасьля скончэных навук, за два месяцы да прызыву, заявіць воінскаму прысутству, што ён пад сваю апеку прыняў матку і падасьць аб гэтым паліцейскае ці іншае удаставерэньне, то прысутства па воінскай павіннасьці павінна абсудзіць яго право на льготу на аснове праўдзіваго палажэньня яго сям'і.

**Аб дабравольцах.** Ваенные ўласьці разьясьнілі, што асобы паступіўшые у ваенны час на службу дабравольцамі павэдлуг Найвышэй зацьвержаных 23-го ліпня 1914 г. правілоў, лічуцца ваенна-абязаннамі з дня залічэньня іх на ваенную службу, і асвабаджэньне іх са службы на ўласнае жаданьне да канца вайнк — не дапускаецца.

**Школы і вайна.** У міністэрстве асьветы зроблена падрахунак, як атклікнулася вайна на заняцьцях у школах. У некаторых губэрнях толькі часьцю пачалося школьнае навучаньне. А ў пяці губэрнях зусім не прыступлена да навукі у школах. Найболей атклікнулася вайна на заняцьцях у духоўных вучэльнях. Гэтак, у найбольшай часьці эпархій (дыэцэзій) памешчэньні духоўных вучэльняў аддадзены на зборные пункты або лазарэты.

**Першае у Петраградзе землямернае вучылішчэ** аткрылі сёлета 2-го кастрычніка.

**Аб чыншэвых землях.** Сэнат разьясьніў, што закон с 14-го сьнежня 1893 г., забараняючый продаж па прыватных узысканьнях селянскай надзельнай зямлі, не расшыраецца на землі, прыдбаные па правілах чыншавога палажэньня 9-го чэрвеня 1886 г., па якіх выкупная пажычка ужо выплачэна.

**Вайна і перэсяленцы.** Ад 1-го сьнежня да 1-го верэсьня сёлетняго году церэз Чэлябінск і Сызрань перайшло на Сібір 315 тысяч перэсяленцоў. Вярнулося 81 тыс. Як атклікнулася вайна на перэсяленьні, паказываюць гэтые лічбы: Летась за тыдзень ад 8-го да 14-го верэсьня прайшло ў Сібір 5 тысяч, вярнулося назад 2 тыс., а сёлета за гэты-ж час прайшло 641 перэсяленец і вярнулося—901.

**Земля для перэсяленцоў.** Глаўнае упраўленьне землеустройства і землядзельля пастанавіло прыступіць к падгатоўцэ новаго зямельнаго запасу у Сібіры для перэсяленцоў. Ёсьць на відавоку прыгатаваць у працягу году 1,580,000 дзесяцін.

**Генерал-губэрнаторство** кіеўскае, падольскае і валынскае скасовываецца. Губэрнатары гэтых губэрній у патрэбных справах будуць зьвертацца да Міністра ўнутрэнніх справоў.

**За падробку тэлеграм аб вайне** арыштована па загаду губэрнатара на тры месяцы рэдактора часопісі «Сумскій Вѣстнік» Дарошэнко.

**Для паліцыі.** Петроградзкі градоначальнік выдаў загад да паліціі, каб пры выпаўненьні службавых абавязкоў быць з усімі беззакіду дэлікатнымі, аказываць поўную законную помач усякаму патрабуючаму, а з асобамі затрымліванымі абыходзіцца суважна.

**Арышт зладзейскай банды.** У Петраград прывезлі трох віленчыкоў: Хрукоўскаго, Столпнера і Гольдбэрга, арыштованых у Маскве. Пры вобыску знайшлі у іх цэнных папероў на 80 тысяч руб. і 14 тыс. руб. гатоўкай. Арыштованые — гэта вядомая банда міжнародных зладзеяў, якая заўсёды прабывала у Вільні і толькі у апошнім часе перанеслася да Масквы.

Суд аб **проціняменкай дэманстрацыі.** Варшаўскі акружны суд спыніў справу 55 студэнтоў-палякоў, вінавачэных у проціняменкай дэманстрацыі перад памешчэньнем нямецкаго консульства у Варшаве у марцы сёлетняго году.

С **Польшчы** паведамляюць, што на прошлым тыдні нейкі час Варшава перэжывала дужэ трывожные часіны—за 15 вёрст ад гораду ішлі заўзятые бітвы паміж расейскім і нямецкім войскамі. Некаторые жыхары пачалі было пакідаць горад. З гэтай прычыны ваенны генерал-губэрнатар выдаў да жыхароў адозву: «Па паручэньню камандуючаго арміей апавешчаю жыхароў даверанаго мне генерал-губэрнатарства, што могуць спакойна адносіцца к цяперашнім здарэньням, бо абарона Варшавы будзе даведзена да найвышэйшай магчымасьці». Цяперака усё успакаіваецца; наступаючые немцы перайшлі к абароне. У Вільні не атрымліваные пару дзён варшаўск. газэты пачалі ізноў прыходзіць.

**У Галіччыне.** У Пачаеўскую Лавру прыехала шэсьць уніяцкіх парохаў, дзе на іхнюю просьбу архіепіскап Евлогій прылучыў іх да праваслаўя. Прылучэные парохі атрымаюць пасьля уніяцкіе парафіі у Галіччыне. — Архіепіскап Евлогій выехаў у Галіччыну для прылучываньня уніятоў к праваслаўю, і ўжо з апрашае к сабе с Холмскай губ. колькі праслаўных сьвяшчэннікоў на аткрываные у Галічыне праваслаўные парафіі. —Тарговые зносіны з Галіччынай наладжываюцца, так што надовічы з Вітэбску на пробу атправілі туды вагон масла.—«Кіеўск. Мысль» паведамляе, што галіцкіе ўласьці забаранілі друкаваньне абвестак (афішоў) на блакітна-жоўтым паперы, або з берэжкамі гэтых фарбоў і агулам ужываньне гэтых «украінскіх» колероў.—Ваенны генерал-губэрнатар Галіччыны Бобрынскі выдаў такую абавязкую пастанову: «Забараняецца прадаваньне с кнігарнеў і кіоскаў, а такжэ выдаваць для чытаньня з бібліотэк кніг на расейскім языку і маларускім нарэчы, надрукованых не ў граніцах Расейскай Імпэрыі. Усе гэткіе кнігі павінны быць зложэны у асобным мейсцы, якое пакажуць мейсцовые ўласьці».

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

Пры гэтым нумэры разсылаецца усім падпісчыкам кніжка: „ЯК ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЗЫСК С КАРОУ“.

## Ад Рэдакціі „Сахі“ і „Лучынкі”.

Рэдакція сельска-гаспад. месячніка «САХА» і літэратурн. месячніка „ЛУЧЫНКА“ перайшлі у Мінску на Захарэўскую вул. № 24 (проці новаго касьцёла).

С прычыны вайны месячнікі прыастанавіліся, а цяперака скора будзе выходзіць „САХА“, а потым „ЛУЧЫНКА“.

**Рэдактар-Выдавец.**
А. Уласоў.

**Друкуецца і скора выйдзе**

**„БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР”**

**на 1915 год.**

Календар друкуецца двумя асобнымі выданьнямі: рускімі і лацінскімі літэрамі, з іншым у кожным тэкстам.

Заказы на календар трэба прысылаць загадзе у „Беларускую Кнігарню“, Вільня, Завальная № 7.

**Прыймаюцца ў календар на сходных варунках абвесткі.**

**Усякую гаспадарскую прыладу:**

сечкарні,
малацарні,
манежы,
шарпакі,
арфы

**СУЛІЦЬ**

**Склад Віленскаго Таварыства Сельскай Гаспадаркі.**

*Вільня, Завальная № 9.*

**Тавару вялікі выбар.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.